тнымі морфамі: <к ~ ч> «адмыкаць — адмычка», <г ~ ж> «берагчы — беражлівы»; <х ~ ш> «арэх — арэшнік», «паслухаць — паслушэнства»; <ц ~ ч> «чарніцы — чарнічнік». Пры апісанні моўных з'яў, прадстаўленых у парадыгматыцы і словаўтварэнні шэрагам альтэрнатыўных варыянтаў, можа выкарыстоўвацца абагульняючая (інварыянтная) адзінка — марфанема. Існуюць 2 віды запісу марфанемы з дапамогай фігурных дужак: {с ~ с' ~ ш} прызначана для аб'яднання морфаў у адну марфему «каса ~ касіць ~ кашу»; $\{^{к}_{ч}\}$ «рука ~ ручка». Ідэю аб функцыянальным характары чаргаванняў у марфеме і іх марфалагічнай абумоўленасці ўпершыню сфармулявалі І.А.Бадуэн дэ Куртэнэ і М.В.Крушэўскі. Тэрмін «М.» ўпершыню ўвёў ва ўжытак М.Трубяцкі. У бел. моваэнаўстве першым на неабходнасць распрацоўкі праблематыкі М. звярнуў увагу П.П.Шуба.

*Літ.*: Шуба П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія. Мінск, 1987; Русак В.П. Марфаналогія сучаснай беларускай мовы. Мінск, 2003; Яе ж. Марфаналогія словазмянення і словаўтварэння сучаснай беларускай мовы. Мінск, 2012; Кандраценя І.У. Нулявая суфіксацыя ў сістэме беларускага словаўтварэння. Мінск, 2009.

*В.П.Русак.*

**МАРФЕ́МА**, мінімальная рэгулярна ўзнаўляльная ў адпаведнасці з мадэлямі пэўнай мовы значымая частка слова. Паняцце «М.» было ўведзена ў лінгвістыку ў 1870-я гг. І.А.Бадуэнам дэ Куртэнэ. Паводле прызначэння ў мове адрозніваюць М. к а р а н ё в ы я (знамянальныя, лексічныя) і а ф і к с а л ь н ы я (службовыя). Да афіксальных М. адносяцца прэфікс, суфікс, конфікс (цыркумфікс), флексія, постфікс, інтэрфікс, інфікс, трансфікс. Паводле статусу ў сістэме мовы вылучаюць с в а б о д н ы я і з в я з а н ы я М. Свабодныя М. матэрыяльна супадаюць з асновай хаця б у адным неслужбовым слове («**во**ля», «**воль**ны», «**воль**насць»). Звязаныя М. функцыянуюць у спалучэнні з інш. М. асновы (каранёвая М. ў словах «абуць», «разуць», «абутак»). Да свабодных М. адносяцца выключна карані. У якасці звязаных М. выступаюць афіксы і нязначная частка каранёў. Па функцыі ў складзе слова адрозніваюць М. с л о в а ў т в а р а л ь н ы я, або дэрывацыйныя («змаг**ар**», «**пера**гнуць»), і М. с л о в а з м я н я л ь н ы я, або рэляцыйныя («смялейшы», «**най**смялейшы»; «дума**ў**», «думала»). У маўленні М. рэалізуецца ў выглядзе канкрэтных варыянтаў — морфаў. Так, у словах «луг», «лужок» каранёвая М. прадстаўлена морфамі «луг-», «луж-». Тоесныя па значэнні і генетычна роднасныя варыянты М. называюцца аламорфамі. Напр., каранёвая марфема слоў «сад», «садзіць», «саджанец» рэалізуецца ў аламорфах «сад-», «садз-», «садж-».

*Літ.*: Шакун Л.М. Словаўтварэнне. Мінск, 1978; Шуба П.П. Сучасная беларуская мова. Марфаналогія. Марфалогія. Мінск, 1987; Бардовіч А.М., Шакун Л.М. Марфемны слоўнік беларускай мовы. Мінск, 1989.

*Д.В.Дзятко.*

**МАРФЕ́МНЫ СЛО́ЎНІК**, с л о ў н і к м а р ф е м н а й ч л я н і м а с ц і с л о ў, тып аднамоўнага слоўніка, які адлюстроўвае марфемную структуру слоў. Апісвае слова як моўную адзінку, якая складаецца з мінімальных значымых элементаў — *марфем*. Падзел слоў на марфемы ў такім слоўніку зроблены з пункту погляду сучаснага разумення марфемнай будовы слова, з улікам яго словаўтваральнай структуры. М.с. дапамагае пры вывучэнні словаўтваральнай сістэмы мовы, структуры слоў, іх правапісу. Першы М.с. у бел. лексікаграфіі — «Марфемны слоўнік беларускай мовы» (складальнікі А.М.Бардовіч і Л.М.Шакун, 1975; 2-е выд. 1989). Выдадзены таксама М.с. — «Марфемны слоўнік беларускай мовы» (складальнік М.А.Аўласевіч, 1998), «Марфемны слоўнік беларускай мовы» (складальнік Т.І.Якубовіч, 2003), «Школьны марфемны слоўнік беларускай мовы» (складальнікі А.М.Бардовіч, Л.С.Мормыш, Л.М.Шакун, 2005, 2-е выд. 2006).



*В.У.Марфіна.*

**МА́РФІНА** Вольга Уладзіміраўна (н. 13.12.1952, г. Калінінград, Расія) беларускі антраполаг. Канд. гіст. навук (1983). Скончыла БДУ (1979). З 1974 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, з 2008 у Ін-це гісторыі НАН Беларусі (з 2014 заг. аддзела). Займаецца комплексным вывучэннем чалавека, у т.л. праводзіць маніторынг фіз. развіцця дзяцей, падлеткаў і моладзі, даследуе пытанні гісторыі антрапалагічных даследаванняў стараж. і сучаснага насельніцтва Беларусі. Адзін з аўтараў кн. «Чалавек і яго біякультурная адаптацыя» (кн. 1—5, 1976—1996), манаграфій «Дзіцячы арганізм і асяроддзе. Фарміраванне фізічнага тыпа ў розных геахімічных рэгіёнах БССР» (1989), «Экалагічныя змены і біякультурная адаптацыя чалавека» (1996), «Антрапалогія насельніцтва беларуска-польскага памежжа ў святле этнічнай гісторыі славян» (2009), «Дынаміка адаптыўнай зменлівасці насельніцтва Беларусі» (2013), «Фізічны тып старажытнага насельніцтва Беларусі» (2014), вучэбных дапаможнікаў для ВНУ. Дзярж. прэмія Беларусі 1998.

*Тв.*: Практическая антропология. Ростов-на-Дону, 2003 (разам з Л.І.Цягака); Основы антропологии. Минск, 2008 (разам з Л.І.Цягака, І.Радзевіч-Грун).

*В.В.Давідовіч.*

**МА́РХЕЛЬ** Таццяна Рыгораўна (н. 19.1.1939, в Шпакоўшчына Смалявіцкага р-на), беларуская актрыса.